# Веснік Глыбоччыны

ГАЗЕТА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

серада, 24 ліпеня 2019 года № 59 (9923)


# САРДЭЧНА ВІТАЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ І ГАСЦЕЙ VII МІЖНАРОДНАГА СВЯТА "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ"!




Фота Алены Хайноўскай.

ЛЯ ДЭКАРАТЫЎНАЙ СКУЛЬПТУРНАЙ КАМПАЗІЦЫІ "ГЛЫБОЦКАЯ ВІШНЯ" ВІШНЁВАЯ СЯМ'Я – ЯЎГЕН І МАРЫЯ РУСАК З СЫНОЧКАМ МАКСІМКАМ.

# ДОРОГИЕ ДРУЗЬЯ!

В седьмой раз на прекрасной глубокской земле проходит «Вишнёвый фестиваль». Этот самобытный яркий праздник, имеющий статус международного, собирает многочисленных гостей с разных уголков нашей страны, а также ближнего и дальнего зарубежья. Фестиваль служит укреплению национальных традиций, презентует полезные креативные идеи и проекты, содействует культурному обмену, укреплению дружеских и деловых связей между регионами разных стран.

Искренне желаю всем жителям Глубoччины, участникам и гостям VII Международного праздника «Вишнёвый фестиваль» крепкого здоровья, отличного настроения, тёплых интересных встреч, радостных, а главное приятных впечатлений.

***В. П. АНДРЕЙЧЕНКО, Председатель Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь.***

# ПАВАЖАНЫЯ ГЛЫБАЧАНЕ, ЗЕМЛЯКІ, ШАНОЎНЫЯ ГОСЦІ!

Сардэчна вітаем вас на «Вішнёвым фестывалі» ў Глыбокім!

Кожную вясну мы дзівімся і захапляемся беласнежнай вішнёвай квецеnню, а ўлетку радуемся багатаму ўраджаю смачных сакавітых ягад, якія спеюць ледзь не ў кожным глыбоцкім падворку. А прывёз іх некалі ў нашы мясціны селекцыянер Баляслаў Лапыр. Менавіта гэтага садавода мы цяпер можам лічыць асноватворцам нашага сённяшняга "Вішнёвага фестывалю". Дзякуючы маштабнаму, яркаму, аздобленаму мясцовым каларытам, святу вішнёвая Глыбоччына стала вядомай не толькі ў краіне, але і далёка за яе межамі.

Сёлета "Вішнёвы фестываль" у Глыбокім збірае сяброў у чарговы, сёмы раз. І няхай сабе сёлетні год на вішні выдаўся скупаватым, затое ён будзе шчодрым на цікавыя сустрэчы, новыя знаёмствы, зацікаўленыя дыялогі, адметныя мерапрыемствы, якія яднаюць людзей і мацуюць міжнароднае супрацоўніцтва. Кожны год у праграме фестывалю нешта змяняецца, але нязменным пры гэтым застаецца яго галоўная місія – папулярызаваць нашы лепшыя традыцыі, культурныя здабыткі, працоўныя і творчыя дасягненні, мацаваць любоў глыбачан да малой радзімы, на якой нам дадзена магчымасць пражыць вялікае жыццё.

Упэўнены, што глыбоцкая вішнёвая сталіца стане райскім куточкам для тых удзельнікаў і гасцей сёлетняга фестывалю, якія любяць і цэняць прыгажосць. Жадаем, каб час, праведзены на глыбоцкай зямлі, вы скарысталі з максімальнай карысцю для сябе: палюбаваліся краявідамі, адпачылі душой, ацанілі зробленае намі, пачаставаліся прысмакамі мясцовай, беларускай, кухні, знайшлі аднадумцаў і сяброў, пазычылі цікавыя ідэі, захавалі ў сваіх сэрцах цяпло глыбоцкай гасціннасці і сонечныя пазітыўныя ўражанні, якімі вы будзеце жыць да наступнай нашай сустрэчы.

Ведайце, што шчырасць і ўсмешкі, мілагучныя ноты, светлыя напевы і душэўныя сустрэчы – гэта ўсё для вас! Прывітаем жа разам наш "Вішнёвы фестываль"!

***А. В. МОРХАТ, старшыня Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта,***
***Г. У. УНУКОВІЧ, старшыня Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў.***

# СЕРДЕЧНО ПРИВЕТСТВУЕМ УЧАСТНИКОВ И ГОСТЕЙ МЕЖДУНАРОДНОГО ПРАЗДНИКА «ВИШНЁВЫЙ ФЕСТИВАЛЬ»!

Фестиваль с новой силой заявляет о себе, подтверждая высокий статус значимого явления в национальной культуре. Время подтвердило: традиции сохранения и развития творчества продолжаются, как и историческое наследие Глубоччины с ее прекрасными вишнёвыми садами.

Сохранение этих ценностей – не единственная особенность фестиваля. Праздничная мозаика нынешнего праздника состоит из множества проектов, среди которых – День общественных объединений «Вишнёвая энергия», День спорта «Вишнёвый город футбола», туристическая и научно-практическая конференции, престиж-встреча «В гостях у Вишнёвой королевы», выставка-презентация подворий, торжественная регистрация брака «Вишнёвая свадьба», конкурс «Вишнёвые наигрыши» и многое другое. Все это, несомненно, позволит создать в городе яркую атмосферу, вовлечь в орбиту фестивальной жизни все больше зрителей.

Обширна и география участников. В этом году фестиваль собирает представителей из России, Латвии, Литвы, Польши, Украины, Молдовы, Грузии и других стран. Развивающееся сотрудничество помогает приобщиться к особенностям культур разных народов, установить новые творческие связи между коллективами.

Пусть этот форум станет живительным источником радости и вдохновения!

Искренне желаем участникам и гостям «Вишнёвого фестиваля» здоровья, отличного настроения, приятных впечатлений от знакомства с гостеприимной глубокской землей!

С уважением,
***Н. Н. ШЕРСТНЁВ, председатель Витебского областного исполнительного комитета,***
***В. В. ТЕРЕНТЬЕВ, председатель Витебского областного Совета депутатов.***

# У КАЗАЧНАЙ РЭЗІДЭНЦЫІ ВІШНЁВАЙ КАРАЛЕВЫ:
## *«РАДЫ, ГОСЦЕЙКІ, ВАС ПРЫВЕЦІЦЬ!»*






• Анатоль ЗІНКЕВІЧ. Фота аўтара.

Адкрыццё рэзідэнцыі Вішнёвай каралевы з удзелам жыхароў Глыбоччыны і шматлікіх гасцей, прадстаўнікоў замежных дэлегацый стала адной з важнейшых падзей мінулагодняга Міжнароднага свята "Вішнёвы фестываль". Відовішчная, непаўторная па сваёй прыгажосці была ўрачыстасць.

Казачны драўляны домік пабудаваны ў форме вішнёвай пяціпялёсткавай вішнёвай кветачкі на набярэжнай возера Кагальнае і сёння прыцягвае кожнага з нас сваёй таямнічасцю. Тэрыторыю рэзідэнцыі ўпрыгожваюць два сімвалічныя вішнёвыя дрэвы, на адным з якіх сімвалічныя ягады-вішні ўпрыгожваюць гербы гарадоў, з якімі Глыбокае супрацоўнічае, падтрымлівае цесныя сяброўскія сувязі, а на другім – на ягадах-вішаньках – сцягі краін-удзельніц "Вішнёвага фестывалю". Ля рэзідэнцыі Вішнёвай каралевы ўстаноўлены таксама бюст вядомаму селекцыянеру Баляславу Лапыру, які вывеў марозаўстойлівы сорт глыбоцкай вішні. Так, шмат радасных яркіх імгненняў падарыла леташняя ўрачыстасць.

А як рыхтуюцца да сустрэчы гасцей у рэзідэнцыі сёлета? З такой мэтай за некалькі дзён да адкрыцця фестывалю аўтар гэтых радкоў адправіўся ў каралеўскія пакоі. На жаль, яе Высокасць адсутнічала – неадкладныя справы, перадсвяточныя клопаты. (Нават у каралевы падрыхтоўка да вішнёвага балю адымае шмат часу). Сустрэлі і правялі па пакоях каралевы яе падданыя – дзяўчаты-прыгажуні, удзельніцы вакальнага ансамбля "Глыбоцкія дзяўчаты" **(на здымках)**.

З вуліцы трапляем ва ўтульны хол, з якога можна кіравацца ў любы з пяці пакояў. Адразу акунаешся ў чароўны свет Вішнёвай каралевы. Тут выстаўлены лепшыя творы юных мастакоў Глыбоцкай дзіцячай мастацкай школы імя Язэпа Драздовіча, фотаздымкі, на якіх адлюстраваны самыя памятныя фестывальныя моманты мінулых гадоў, сувеніры і падарункі ад гасцей Міжнароднага свята. А колькі смакаты вішнёвай у каралевы! Тут і варэнне, і сок, напіткі розныя, выпечка, торты, піроўныя … І гэта нягледзячы на тое, што ўраджай на вішні ў гэтым годзе не вельмі багаты.

Карацей, пахадзіў па пакоях, адпачыў, чайку з вішнёвым варэннем папіў, пра навіны распытаў. Даведаўся пра тое, як Вішнёвая каралева сёлета будзе прымаць гасцей. У яе рэзідэнцыі пройдзе прэстыж-сустрэча. Кажуць, што сюрпрыз чакае ўсіх. Казачнай стане дарожка ўздоўж набярэжнай возера Кагальнае, якая вядзе ад каралеўскай рэзідэнцыі ў бок СШ №1 імя П. В. Сухога. На ёй, а, дакладней, над ёй, над дарожкай, устаноўлены арачныя канструкцыі, кожная з якіх сімвалізуе краіну-ўдзельніцу "Вішнёвага фестывалю". Зрэшты,



неўзабаве мы ўсё гэта ўбачым наяву. Але ж! Вішнёвая каралева не перастае нас здзіўляць сваімі казачнымі дзівосамі!

# ЗА ЧТО ГЛУБОЧАНЕ ЛЮБЯТ «ВИШНЁВЫЙ ФЕСТИВАЛЬ»?

● Наталия БЕЛЬСКАЯ.

#БЛИЦ-ОПРОС

Вчера в Глубоком прошли первые мероприятия седьмого по счёту Международного праздника «Вишнёвый фестиваль». В эти июльские дни к нам приезжают гости из разных уголков Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья, чтобы угоститься самой вкусной глубокской вишенкой, себя показать и на других посмотреть. Ежегодного масштабного мероприятия с нетерпением ждут и глубочане. В преддверии фестивальных дней мы поинтересовались у жителей нашего края, за что они любят «Вишнёвый фестиваль»?

**Борис Заяц:**



– Для меня «Вишнёвый фестиваль» – это время новых интересных знакомств и, конечно, встреч со старыми друзьями. В этом году с нетерпением жду на праздник друзей и хороших знакомых из латвийского Даугавпилса, из Вильнюса, Минска, Санкт-Петербурга, из города Берёза Брестской области, из польского городка Вольштын, где недавно побывали глубокские артисты. Некоторые приедут в Глубокое впервые, с некоторыми мы давно дружим, они приезжают к нам каждый год и успели полюбить и наш город, и фестиваль. А ещё фестиваль для меня, как для председателя Залесского сельисполкома, – время хлопотное, ведь каждый сельсовет выставляет в главный день праздника своё подворье. Мы заранее разрабатываем меню, чтобы удивить гостей не только вкусностями с вишней, но и блюдами белорусской национальной кухни.

**Семья Сергея и Олеси Пучинских:**



– Уверены, что для всех глубочан, как и для нас, «Вишнёвый фестиваль» – это праздник, по значимости, пожалуй, второй после Дня Независимости Республики Беларусь. Здорово, что в широкой программе фестиваля есть мероприятия на любой вкус. Мы любим концерты и конкурсные программы, с удовольствием посещаем ярмарку работ народных мастеров, не пропускаем шествие Вишнёвой королевы. К сожалению, большинство мероприятий фестиваля проходят в будние дни, когда за работой не успеваешь по-настоящему окунуться в праздничную атмосферу, которая царит в городе. Поэтому мы с нетерпением ждём самого интересного и насыщенного финального дня. А самый маленький член нашей семьи – доченька Иришка -- ждёт детских развлечений и катания на каруселях.

**Надежда Хрол:**



– Для меня фестиваль – это праздник, лето, хорошее настроение и много положительных эмоций. В фестивальные дни наш красивый уютный город как будто преображается, становится больше и краше, ведь на праздник приезжает много гостей и участников из разных городов и стран. И это возможность для нас, глубочан, рассказать всем о нашем городе, чтобы с каждым годом гостей на фестивале было больше и больше. Для нашей семьи самый любимый фестивальный день – день спорта и день закрытия, но и другие интересные мероприятия стараемся не пропускать. Всегда болеем за участников молодёжного авто-шоу и ждём концертной программы «Мы – вместе!», ведь не так часто к нам в Глубокое приезжают звёзды эстрады. Фестиваль – это здорово!

**Любовь Будо:**



– «Вишнёвый фестиваль» – одно из самых ярких культурных событий года в нашем городе. Очень здорово, что этот праздник у нас есть и что мы, глубочане, можем не только посещать в эти дни концерты и многочисленные мероприятия, но и сами в них участвовать. В этом году, например, наша семья подала заявку на участие в районном этапе фестиваля по футболу «Мама, папа, я – футбольная семья», который пройдёт в день закрытия «Вишнёвого фестиваля». Несколько лет подряд я по старым домашним рецептам пеку к празднику вишнёвые кексы и пирог с вишней, которые потом украшают стол на подворье Уделовского сельсовета. Поэтому, когда прихожу на праздник, – обязательно обхожу все подворья и каждый раз не перестаю удивляться кулинарным и творческим способностям своих земляков. К сожалению, не всегда получается бывать на мероприятиях в будние дни, но в день закрытия мы гуляем по городу до позднего вечера, чтобы ничего не пропустить.

# НЕ ШКАДУЙЦЕ АПЛАДЫСМЕНТАЎ ДЛЯ ГАСЦЕЙ ЧАКАНЫХ

ЯРКІ, САМАБЫТНЫ, АДМЕТНЫ, КАЛЯРОВЫ, СПЕЎНЫ! ТАКІМ НАШ "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ" МЫ БАЧЫМ ШТОГОД, ДЗЯКУЮЧЫ ІМ, ТАЛЕНАВІТЫМ АРТЫСТАМ, ЯКІЯ ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ ЗДАЛЁК ДА НАС, У ФЕСТЫВАЛЬНАЕ ГЛЫБОКАЕ. ДЗЯКУЮЧЫ ГЭТЫМ КАЛЕКТЫВАМ, ЖЫХАРЫ І ГОСЦІ ВІШНЁВАЙ СТАЛІЦЫ ЗНАЁМЯЦЦА З ТВОРЧАСЦЮ САМЫХ РОЗНЫХ КРАІН, А "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ" КВІТНЕЕ АД ІХ ЯРКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАСЦЮМАЎ, ВІРУЕ АД ІХ ЗАХАПЛЯЛЬНЫХ ТАНЦАЎ, СПЯВАЕ АД ІХ МЕЛАДЫЧНЫХ ПЕСЕНЬ І МУЗЫЧНЫХ КАМПАЗІЦЫЙ.
МЫ РАДЫ ВІТАЦЬ ВАС, УДЗЕЛЬНІКІ VII МІЖНАРОДНАГА СВЯТА "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ"! ДАВАЙЦЕ З ВАМІ ЗНАЁМІЦЦА!



Ансамбль песні і танца “Кеблава”.



Ансамбль грузінскай народнай песні і танца.



Маладзёжная група народных танцаў “Струга”.



Ансамбль акардэаністаў “Верные друзья”.

**Маладзёжная група народных танцаў “Струга” (Рыебіньскі край, Латвійская Рэспубліка)**

Калектыў створаны ў верасні 2013 года. З гэтага часу актыўна выступае на розных сцэнічных пляцоўках, папулярызуючы латышскія і латгальскія танцы. Удзельнікі аб’яднаны любоўю да народнага танца і лічаць, што іх місія – несці людзям радасць.

**Інструментальны ансамбль баяністаў “Гармоніка” (г. Балта, Рэспубліка Украіна)**

Калектыў, які складаецца з таленавітых вучняў і улюбёных у сваю справу выкладчыкаў, створаны толькі ў мінулым годзе, а ўжо сёлета стаў лаўрэатам абласнога конкурсу ў Адэсе.

**Ансамбль “Жураўка” (Інчукалнскі край, Латвійская Рэспубліка).**

**Ансамбль грузінскай народнай песні і танца (мэрыя Тэлаўскага муніцыпалітэта, Рэспубліка Грузія)**

Сёлетні год для калектыву юбілейны, ён адзначае сваё дзесяцігоддзе. За гэты час ансамбль быў удзельнікам шматлікіх фестываляў і конкурсаў, дзе з годнасцю прадстаўляў творчую культуру сваёй рэспублікі.

**Ансамбль песні і танца “Кеблава” (г. Вольштын, Рэспубліка Польшча)**

Створаны ў 1975 годзе. За гэты час атрымаў шмат узнагарод і прызоў, але самым важным для сябе лічыць ганаровы знак “Заслужаны для польскай культуры”, які атрымаў у 2006 годзе ад Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны. Група, якая перад вамі прадставіць сваё выступленне, пачала займацца фальклорам у 2010 годзе. У рэпертуары калектыву танцы і спевы з сямі рэгіёнаў Польшчы. Кіраўнік – Сільвія Катлярская.

**Ангеліна Ламака і Максім Цупрыкаў (Рэспубліка Беларусь)**

Фіналістка нацыянальных адборачных тураў “Славянскі базар у Віцебску”, “Еўрабачанне”, “Новая хваля”; фіналістка тэлепраекта “Я спяваю”; лаўрэат міжнародных конкурсаў, таленавітая артыстка, чые карані ідуць з Глыбоччыны. У дуэце з Ангелінай Ламака будзе спяваць Максім Цупрыкаў.

**Ансамбль акардэаністаў “Верные друзья” (г. Остраў, Расійская Федэрацыя)**

Калектыў дзіцячай школы мастацтваў горада Острава Пскоўскай вобласці існуе больш за 15 гадоў. Названы ансамбль у гонар легендарнага кінафільма “Верные друзья”, у якім адну з галоўных роляў сыграў ураджэнец горада Остраў, народны артыст СССР Васіль Меркур’еў. Калектыў неаднаразова станавіўся лаўрэатам абласных і міжнародных конкурсаў і фестываляў, а яго ўдзельнікі Шановіч Мікіта, Голікаў Данііл з’яўляюцца лаўрэатамі прэміі “Юныя таленты Пскоўшчыны”. Кіраўнік ансамбля – Вера Назаранка.

**Эстрадна-фальклорны ансамбль “Гармония” (г. Увара, Расійская Федэрацыя)**

Лаўрэат чацвёртага міжнароднага летняга фестывалю фальклору ў Сербіі, актыўны ўдзельнік усіх абласных і гарадскіх мерапрыемстваў. Кіраўнік – Валянціна Кабзар.

# НАТХНЁНЫЯ ГЛЫБОЦКАЙ ВІШНЯЙ

● Тэкст і фота Алеся ЖЫГУНОВА.

**З ЗАГАДЧЫКАМ ДОМА РАМЁСТВАЎ, НАРОДНЫМ МАЙСТРАМ БЕЛАРУСІ СВЯТЛАНАЙ СКАВЫРКАЙ СУСТРЭЛІСЯ НА ДРУГІ ДЗЕНЬ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЯНА ПРЫЕХАЛА З ВІЦЕБСКА СА "СЛАВЯНСКАГА БАЗАРУ".**



Майстры Дома рамёстваў Алена Дабравольская і Арцём Фамін дэманструюць вырабы вішнёвай тэматыкі.





– Цікавых сустрэч было шмат, і яшчэ жыву ўражаннямі ад іх, – заўважыла Святлана. – І настрой цудоўны: нашы народныя майстры сталі пераможцамі і прызёрамі ў розных конкурсах, якія праходзілі ў рамках праграмы "Славянскага базару". Падыходзіў к нам і Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Паўлавіч Бондар, у размове з ім прагучала і тэма "Вішнёвага фестывалю" ў Глыбокім. Мы падарылі Юрыю Паўлавічу вішнёвы сувенір – прыгожую лялькy, – маляванку і запрасілі на наша свята.

*–Прыедзе?*

–Не ведаю, але мы запрашалі вельмі шчыра.

***–Штогод майстры Дома рамёстваў рыхтуюцца к вішнёваму фэсту. Чым адметны гэты год?***

–Ведаеце, для нас кожны год адметны: думаем, прыдумваем, творым і, канечне ж, у сваіх работах не хочам паўтарацца. Хочам здзівіць глыбачан і гасцей горада чымсьці новым. К вашаму прыходу падрыхтавалі невялічкую выставу сувеніраў вішнёвай тэматыкі. Дарэчы, усе нашы сувеніры – лапатачкі, магніцікі, вішнёвыя лялькі, гліняныя статуэткі, пано, іншыя вырабы – можна набыць у дні фестывалю. Вялікіх рэчаў мы не рабілі, бо ведаем: іх не купляюць. А вось дробных сувеніраў зрабілі шмат, яны ідуць нарасхват. Больш таго: сёлета ў асноўны дзень свята, 27 ліпеня, на плошчы будзе працаваць фотазона, дзе з гэтымі сувенірамі можна сфатаграфавацца ў вішнёвых вяночках.

***– Ведаю, што к "Вішнёваму фестывалю – 2019" разам з вамі актыўна рыхтаваліся майстры Дома рамёстваў і народнага клуба майстроў "Крыніца". Цікава: а, можа, Святлана Скавырка як кіраўнік Дома рамёстваў, як народны майстар Беларусі мела яшчэ нейкае даручэнне ў час падрыхтоўкі да свята?***

–Так, я адказваю за падрыхтоўку да абласнога пленэра, які пройдзе ў дні фестывалю з 25 па 27 ліпеня. І 27 ліпеня, у апошні дзень свята, мы адкрыем вялікую выставу маляванак, і яна будзе прысвечана нашаму знакамітаму мастаку Язэпу Нарцызавічу Драздовічу. Адчуваю: наколькі гэта важна для мяне. І па той прычыне, што пленэр адбудзецца на Глыбоччыне, і мне хочацца, каб ён прайшоў як мага лепш.

***–Святлана, вы вядомы ў Беларусі як таленавіты мастак, як аўтар цудоўных маляванак, якія, можна так сказаць, "разышліся" па ўсім свеце. Як часта на вашых работах паяўляецца вобраз Вішні, іншыя вобразы, звязаныя з правядзеннем "Вішнёвага фестывалю" ў Глыбокім?***

–Скажу так: не рэдка. Напрыклад, к пятаму фестывалю я намалявала трыццаць маляванак з вобразам Вішні, і ўсе яны былі ўручаны гасцям свята. Вішнёвая тэма блізкая і мне, і нашым майстрам, і ўсім творцам раёна. Інакш і быць не можа. Бо, куды ні глянеш, – сад альбо садок. І, канечне ж, вішнёвы. Таму са святам усіх нас, з "Вішнёвым фестывалем-2019".

# СЧАСТЬЯ ВАМ, ВИШНЁВЫЕ СЕМЬИ!

● Елена ХАЙНОВСКАЯ.
Фото из архива редакции и семейного архива Анастасии СОРОКА и Марии РУСАК.



Евгений и Мария Русак. 2013 год.


Денис и Анастасия Сорока. 2013 год.


Семья Сорока в 2019 году. Вместе с мамой и папой прелестные детки – Ванечка и Машенька.

«Вишнёвая свадьба» – один из самых красивейших и трогательных моментов фестивальных дней. Молодожёны клянутся в любви и верности друг другу в присутствии родных, близких, друзей… и Вишнёвой королевы. Эта чудесная традиция зародилась на первом «Вишнёвом фестивале» и продолжается из года в год. Тогда церемония проходила на главной городской сцене. В брак вступали сразу четыре пары, между прочим, фестивальный рекорд.

– Это было очень волнительное для нас мероприятие. Во-первых, сама свадьба всегда волнительна. Во-вторых, «Вишнёвый фестиваль» – первый, и мы были первооткрывателями, – рассказывает глубочанка Мария Русак, одна из участниц того праздничного действа. – Когда нам предложили поучаствовать в «Вишнёвой свадьбе», признаемся, вначале мы с Евгением задумались: было как-то боязно выйти на сцену… Но решились и нисколечко не пожалели. Было очень-очень здорово! Мы, четыре пары молодожёнов, стояли на сцене как одна команда – это событие нас объединило. И внимания хватило всем. Казалось, весь город собрался на нас посмотреть, а ещё прибавьте гостей, приглашённых на четыре свадьбы. Круче, чем у нас, наверное, свадьбы в Глубоком не было!

После торжественной регистрации молодожёны поспешили совершить ещё одно действие, зародившееся тогда, – потереть ягодки на открывшейся тогда декоративной скульптурной композиции «Глубокская вишня». На рождение деток.

– Мы тогда «потерли» на двоих: мальчика и девочку. На следующий год после свадьбы нас Вишнёвая королева пригласила на открытие праздника – мы ждали пополнения в семье. Ещё через год наша семья поучаствовала в фестивальных мероприятиях в новом составе – сыночку было шесть месяцев, – вспоминает Мария. – На «Вишнёвых фестивалях» всегда стараемся побывать: посещаем мероприятия, насколько позволяет малыш. И как «вишнёвая» семья каждый год варим вишнёвый компот!

Максимке Русаку – четыре годика. И вместе с мамой Марией и папой Евгением он уже очаровательно позирует возле той судьбоносной для его родителей вишенки ***(снимок на 1-й полосе газеты)***. Сыночек у семьи Русак уже есть. Пусть родится и девочка! Не зря же мы пригласили Марию и Евгения для фотосессии возле «Глубокской вишни» – вдруг надо ягодкам напомнить об их первой семейной просьбе.

* * *

Семью Дениса и Анастасии Сорока, – одну из тех четырёх пар, чья регистрация прошла на первом «Вишнёвом фестивале», – мы разыскали в соседнем Полоцке.

– Очень приятно, что о нас помнят, – сказала Анастасия. – Эти первые в истории Глубокого вишнёвые свадьбы, помним и мы. Интересно было. Потом ещё долго наши друзья из других городов восхищались увиденным.

27 июля Денис и Анастасия Сороки отметят чугунную свадьбу – прошло уже шесть лет с той памятной регистрации. За это время их семья выросла: сыночку Ванечке – 4 года, доченьке Машеньке – 2 года. «Вишнёвая» семья растёт и пополняется.

* * *

Красивую традицию «Вишнёвая свадьба» организаторы продолжат и в этом году. Ещё одну молодую пару поприветствует Вишнёвая королева на набережной озера Кагальное. Именно сюда, в Сквер молодожёнов, шесть лет назад с городской сцены переместилась торжественная регистрация брака «вишнёвой» семьи. Церемония состоится в субботу, 27 июля, в 14.00.

# ЧЫМ НАС ЗДЗІВЯЦЬ І ПАРАДУЮЦЬ «ВІШНЁВЫЯ НАЙГРЫШЫ-2019»?

● Тэкст і фота Алеся ЖЫГУНОВА.

**У 2015 ГОДЗЕ ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ СТАРШЫНІ РАЙВЫКАНКАМА АЛЕГА МОРХАТА ЎПЕРШЫНЮ Ў РАМКАХ ПРАГРАМЫ “ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ” ПРАЙШОЎ КОНКУРС МУЗЫКАНТАЎ “А ГАРМОНІК ГРАЕ, ГРАЕ…”. ПРАЙШОЎ І АДРАЗУ ПАЛАНІЎ СЭРЦЫ СЛУХАЧОЎ. РАДАВАЎ ЁН НАС І Ў НАСТУПНЫЯ ГАДЫ І ЎРЭШЦЕ СТАЎ АДНЫМ З САМЫХ ПАПУЛЯРНЫХ І ЛЮБІМЫХ НА ГЛЫБОЧЧЫНЕ.**

Цяпер ужо наш вішнёвы фэст проста немагчыма ўявіць без музыкаў, якія прыязджаюць, каб паспаборнічаць за Гран-пры конкурсу – вішнёвы баян – не толькі з Беларусі, але і з іншых краін свету – Расіі, Латвіі, Літвы, Грузіі… Улічваючы тое, што сёлета конкурс будзе праходзіць у пяты раз (чым не маленькі юбілей?), ёсць добрая нагода для таго, каб вярнуцца да вытокаў гэтага найцікавейшага творчага спаборніцтва.

## “ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ – 2015”

Музыкантаў было дванаццаць. Інтрыга конкурсу заключалася ў тым, што за перамогу змагаліся не толькі гарманісты, баяністы і акардэаністы з нашага раёна, але і госці фестывалю: Давід Отарашвілі з Грузіі і Петэрэс Волантс з Латвіі. Адразу скажам: Глыбоччына была прадстаўлена вельмі моцнымі музыкантамі. За Гран-пры вырашылі пазмагацца Таццяна Кузьміч з Глыбокага, Віктар Сіняўскі з Мацюкова, Уладзімір Бурэнь і Юрый Стрэльчанка (абодва з Падсвілля). Адзначым таксама, што, акрамя прафесіяналаў, на сцэну выходзілі і аматары, якія кіраваліся алімпійскім прынцыпам: галоўнае не перамагчы, галоўнае – паўдзельнічаць. Але не скажаш, што іхнія выступленні не ўразілі слухачоў. Уразілі. А Таісія Дударонак з Кішоў не толькі іграла, але і спявала. І словы песні кранālі за душу кожнага, хто прыйшоў у гэты дзень на Цэнтральную плошчу горада: “Дзе мне не быць, век не забыць сонца ў азерцы. Успамінаць, век мілаваць свой кут у сэрцы”.

І ўсё ж у барацьбе за Гран-пры менавіта прафесіяналы канкурыравалі між сабой. Больш удачлівым у гэты дзень аказаўся ўдзельнік народнага тэатра фальклору “Цярэшка” Юрый Стрэльчанка. Пад апладысменты гледачоў яму як першаму пераможцу першага музычнага конкурсу “А гармонік грае, грае”, які праходзіў у рамках праграмы фестывалю, старшыня райвыканкама Алег Морхат уручыў вішнёвы баян.


“Вішнёвы фестываль-2017”: іграе лаўрэат усерасійскіх і міжнароднага конкурсаў Мікалай Шкарын.


Уладзімір Бурэнь прадаўжае радаваць нас сваёй музыкай.

## “ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ-2016”

Другі конкурс стаў адметны не толькі тым, што пашырылася яго геаграфія (Браслаў, Докшыцы, Варапаева, Вілейка, Полацк, г. Краслава (Латвія), Глыбокае, Падсвілле), але і тым, што вынікі падводзіліся ў дзвюх узроставых групах, бо ў конкурсе ўдзельнічалі і юныя музыканты. Адкрыццём стала выступленне акардэаніста Арцемія Казачука з Латвіі, які выканаў папуры на тэмы самых папулярных песень савецкага перыяду. Хлапчук з горада Краслава сваёй музыкай і песнямі зачараваў і журы, і публіку. І, можа, нечакана для ўсіх быў названы пераможцам.

Усё ў тым, што Уладзімір Бурэнь, які, несумненна, выступіў лепш за ўсіх на конкурсе гэтага года, свой Гран-пры вырашыў падарыць юнаму музыканту з Латвіі. Гэтае рашэнне падтрымаў і ўхваліў старшыня райвыканкама Алег Морхат і ўручыў Арцемію Казачуку навюткі прыгожы баян. А Уладзіміру Бурэню паабяцаў на фэсце наступнага года таксама падарыць баян.

## “ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ-2017”

На фестывалі гэтага года музычны конкурс ужо стаў называцца інакш: “Вішнёвыя найгрышы”. І трэба сказаць, што здзівіў і ўразіў ён шмат чым. І выступленнем шоу-дуэта “Пра-баян” з Магілёўскай абласной філармоніі, і разнастайнай праграмай, у якой удзельнічалі баяністы і гарманісты з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, і тым, што на цырымоніі ўзнагароджвання, акрамя Гран-пры, быў уручаны яшчэ адзін баян. Адметнасцю вызначаўся таксама склад журы, у якім працавалі і спецыялісты Магілёўскай абласной філармоніі. Вагу конкурсу дабаўляла і тое, што ў ім прымаў удзел лаўрэат абласных, усерасійскіх і міжнароднага конкурсаў “Іграй, гармонік!” Мікалай Шкарын з Расіі (Мікалай атрымае Дыплом лаўрэата І ступені).

Так атрымалася, што на сцэне гледачы пабачылі адразу двух лепшых музыкантаў двух папярэдніх конкурсаў – Юрыя Стрэльчанку і Уладзіміра Бурэня.

А пераможцам “Вішнёвых найгрышаў-2017” стала Таццяна Кузьміч, выкладчыца Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў. З цудоўным выступленнем Таццяну павіншаваў і ўручыў ёй Гран-пры старшыня райвыканкама А. В. Морхат. Праз пару хвілін Алег Віктаравіч узяў у рукі другі баян.

–Як і абяцаў у мінулым годзе, гэты баян – узнагарода Уладзіміру Бурэню, – заўважыў ён. – Уладзімір не толькі таленавіты баяніст, але і шчыры, добры чалавек. Пераканаены: ігрой на баяне музыкант будзе яшчэ доўга радаваць нас.

(Канцэрт ансамбля “Два Баяны” ў складзе Мікалая Савуліча і Уладзіміра Бурэня, які мы пабачылі на раённым свяце “Квітней, Глыбоччына!”, пацвердзілі словы старшыні райвыканкама).


Новы вішнёвы баян чакае свайго ўладальніка.

## “ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ -2018”

Конкурсная музычная праграма фэсту гэтага года пачалася з выступлення баяністаў народнага тэатра фальклору “Цярэшка”, дыпламантаў ІІ ступені конкурсу “А музыкі граюць, граюць” на “Славянскім базары ў Віцебску”. Чарговае свята музыкі стала сапраўды яркім і прайшло на высокім выканаўчым узроўні. Гучалі акардэоны, баяны… Хораша, прыгожа, І усе ж слухачам не хапала гармоніка. Так хацелася пачуць звонкія, іскрыстыя, знаёмыя з маленства мелодыі менавіта на двухрадцы. І слухачы пачулі іх. Кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля песні і музыкі “Крыніца” Міхаіл Шлег (Дуброўна) так урэзаў “Беларускую польку”, што ногі самі пайшлі ў скокі. Станіславас Румбуціс (Літва) прадоўжыў выступленне “Пецярбургскай полькай”. І абедзве полькі запалі ў душы і выклікалі шквал эмоцый і апладысментаў. Цёпла сустрэлі глыбачане і госці горада выступленні Мікіты Шановіча і Данілы Голікава (Расія), Аляксея Семянковіча і Ганны Семянковіч (Магілёў), Паўла Іванчыкава (вёска Запруддзе), Віталя Пачкоўскага (Глыбокае), Заслужанага работніка культуры Расійскай Федэрацыі Галіны Варапаевай.

І ўсё-такі найлепшым (так вырашыла журы) стала выступленне Міхаіла Шлега. Ён і атрымаў Гран-пры конкурсу – вішнёвы баян.

* * *

Мы нагадалі вам, як чатыры гады запар у рамках “Вішнёвага фестывалю” ў Глыбокім праходзіў конкурс музыкантаў “Вішнёвыя найгрышы” (першая назва – “А гармонік грае, грае…”). Спадзяёмся, што і “Вішнёвыя найгрышы-2019” гэтак жа шчыра парадуюць нас.

# ВКУС ВИШНИ НЕЗАБЫВАЕМ!

● Елена ХАЙНОВСКАЯ.
Фото из архива
семьи МОЙСЕЁНОК.

